# У падарожжа - па Белавежскайпушчы.

НА ЗАПАВЕДНЫХ ПУШЧАНСКІХ СЦЕЖКАХ ЦІШЫНЯ ДЫ СУПАКОЙ: ЧУВАЦЬ ТОЛЬКІ ВЯСЁЛЫ ГОМАН ПТУШАК, АБЛОКІ І ДУБРОВЫ ГЛЯДЗЯЦЦА Ў БЛАКІТНЫЯ РЭКІ...

Пушча як быццам і не ведае пра будучы юбілей. Але калі знаходзішся каля аднаго з карпусоў гасцінічнага комплексу нацпарку, бачыш: падрыхтоўчыя работы ідуць поўным ходам. У прыватнасці, тут да верасня павівен з'явіцца новы будынак музея прыроды.

Зрэшты, справа не толькі ў музеі. Перамены перажывае практычна ўся інфраструктура парку. І гэта нядзіўна, бо сучаснаму турысту да прыроднай прыгажосці яшчэ і камфорт падавай. Таму ў нацпарку зусім нядаўна вырас новы гасцінічны корпус. Увосень будзе здадзена яшчэ адна гасцініца, у вёсцы Каменюкі. "Мы робім усё для таго, каб турыст з любымі запатрабаваннямі знайшоў свой адпачынак, — адзначае начальнік музея прыроды Людміла Улашчык. — Хтосьці хоча жыць у камфорце — калі ласка, хтосьці хоча быць бліжэй да прыроды — прачынацца пад спеў птушак — такая магчымасць таксама ёсць. Мы прапануем турысту цэнавую разнастайнасць. Напрыклад, уКаменюках цэны будуць значна ніжэйшыя, каб адпачынак быў даступны для дзяцей і модадзі. Плануем арганізаваць дзіцячае аздараўленне".

Але паклоннікаў пушчанскага адпачынку і сёння дастаткова. Колькасць іх павялічваецца. Дарэчы, ёсць тыя, для каго паездкі ў пушчу сталі добрай традыцыяй. Напрыклад, для сям'і Янчанкаў. Галава сям'і Сяргей з жонкай і сынам прыязджаюць сюды ўжо ў другі раз — паглядзець вальеры, прагуляцца па пушчы, наведаць Дзеда Мароза.

Дарэчы, уладанні Дзеда Мароза — выдатная выдумка, да якой наведвальнікі Белавежскай пушчы неабыякавыя ўжо больш як пяць гадоў. Ідзверы тут, як высветлілася, адчыненыя на працягу года. А ў Дзеда Мароза — цэлая калекцыя ўбораў па сезоне. Нядзіўна, што большасць турыстаў лічыць сваім абавязкам глянуць на беларускага ўладара зімы. Уражваюць і тэрыторыя рэзідэнцыі, і гісторыі, якія есць у кожнага церамочка, дрэўца і нават... люстэрка. Апошняе, вядома ж, чароўнае і знаходзіцца ў святліцы Снягуркі. Акалі ў яго зірнуць, яно дорыць вечную маладосць. Вось чаму ўнучка Дзеда Мароза заўсёды прыгожая і маладая!

Але легенды легендамі, а турыстаў у нацпарк, несумненна, прываблівае і рэальная гісторыя, бо ён за сотні гадоў існавання памятае і часы царскага палявання, і войны. Асабліва шмат бед прынеспа пушчы Першая сусветная вайна. Калі тэрыторыя апынулася пад уладай германцаў, яны сталі актыўна секчы каштоўную драўніну, пабудавалі не толькі 4 лесапільныя заводы, але і, каб неяк вывозіць нарабаванае, 300 кіламетраў чыгункі... На шчасце, у Другую сусветную гэтага не здарылася — бліжэйшы паплечнік Гітлера і заўзяты паляўнічы Герынг вырашыў зберагчы гэту тэрыторыю, каб у будучыні стварыць тут паляўнічую гашадаркурэйха...

Гісторыю пушчы свята захоўваюць доўгажыхары Белавежы. Напрыклад, нам на шляху трапілася 350-гадовая хвоя вышынёй больш за 30 метраў і больш за метр у дыяметры. Любаваліся волатаўскім выглядам 600-гадовага дуба і нават прымяраліся, колькі ж чалавек зможа яго абхапіць. Дарэчы, як адзначыла Людміла Улашчык, гэта не самыя старыя дрэвы ў нацпарку. Ёсць яшчэ старэйшыя — у запаведнай зоне.

Але жыццё не стаіць на месцы і ўпісвае ў гісторыю лесу новыя старонкі. Так, свае сляды пакінуў на запаведных тэрыторыях ураган 2002 года. Ад яго, расказала Людміла Улашчык, пацярпела нямала дрэў. Можа, іх было 6 і больш, калі б асноўны ўдар на сябе не прыняло возера Лядское. Менавіта яно, паводле слоў субяседніцы, пагасіла сілу ўрагану, роўнага па сіле тарнада... Сёння вадаём багаты

рыбай (тут водзіцца нават рак — прыродны індыкатар чысціні), яго аблюбавалі лебедзі.

Аднак не з усімі праблемамі мудрая прырода можа справіцца самастойна. І гэта ўлічана ў спецыяльна распрацаваным плане кіравання запаведнай тэрыторыяй, які пасля 2010 года будзе аб'яднаны яшчэ і з польскім планам (нагадаю, што Белавежская пушча знаходзіцца на тэрыторыі дзвюх дзяржаў). "Нацпарк знаходзіцца ў акружзнні урбанізаваныхтэрыторый — зялёная пля-ма на белым фоне, — расказвае намес-нік генеральнага дырэктара па навуцы нацпарку "Белавежская пушча" Васіль Арнольбік. — Гэта, безумоўна, робіць уплыў на запаведную тэрыторыю".

Але самы цяжкі ўдар па пушчы, паводле яго слоў, нанесла меліярацыя, паколькі ўся тэрыторыя вакол пушчы— і беларуская, і польская — меліяраваная. Але ж менавіта асушэнне ў свой час стала бічом яловых і ясянёвых лясоў. У сувязі з гэтым — гэта і рэкамендацыя экспертаў ЮНЕСКА, якія нядаўна набывалі ў Беларусі (у 1992 годзе Белавежская пушча ўключана ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА),— плануеццаправесцімерапрыемствы па аднаўленні гідралагічнага рэжыму.

Адным з такіх аб'ектаў стане балота Дзікае плошчай каля 15 тысяч гектараў. Гэта унікальнае нізіннае балота, месца пражывання такога рэдкага ў Еўропе віду, як вяртлявая чарацянка. Дарэчы, і янапацярпелааднеразумнаймеліярацыі, паколькі балота, якое і без таго асушвалася, у апошнія засушлівыя гады абмялела яшчэ больш і стала зарастаць драўнянай расліннасцю, выцясняючы асаку, дзе жыве птушка. Праект абваднення, паводде слоў Васіля Арнольбіка, рыхтуецца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі пры ўдзеле замежных фондаў.

***Вераніка Арцем'ева***

**Источник:**Беларусь.-2009.-№ 7.-С. 38-39.

